*Андрэй Блінец*

# Маёмасць Нясвіжскага замка ў 1914–1920 гг.

На пачатку XX ст. Нясвіжскі замак князёў Радзівілаў перажываў чарговы перыяд свайго ўздыму, як культурнага цэнтра. Намаганнямі Марыі Дароты дэ Кастэлян і яе мужа Антонія Вільгельма Радзівіла палац быў адноўлены пасля доўгіх гадоў заняпаду. Сюды вярнуліся фамільны архіў і калекцыя рыцарскіх даспехаў, была створана новая бібліятэка. Марыя Дарота дамаглася вяртання з Эрмітажа шэрага прадметаў, вывезеных падчас вайны 1812 г. У Нясвіж, які стаў галоўнай рэзідэнцыяй Радзівілаў, былі перавезены многія рэчы з Берлінскага палаца: зброя, сталовы посуд, паляўнічыя трафеі, нумізматычны збор [16, s. 296–297]. Знаўца даўніны і калекцыянер Аляксандр Ельскі, які наведаў замак у верасні 1905 г., адзначаў: *«Я аглядаў каштоўную рыцарскую конскую збрую, вялікія вітрыны, запоўненыя пекнай халоднай зброяй, булавамі гетманаў і маршалкаў, пярсцёнкамі, бунчукамі, рэгаліямі, пячаткамі, разнастайнымі дарагімі памяткамі і*

*дарамі каралёў сям'і Радзівілаў, каштоўнымі пярсцёнкамі і кляйнотамі жанчын дому, вырабамі ювелірнага, мініяцюрнага, збройнага, сфрагістычнага мастацтва... А які архіў знаходзіцца ў замку! Гэта сапраўдная скарбніца для вывучэння айчыннай гісторыі. Тут ёсць цэлыя галерэі з шафамі, запоўненымі ўпарадкаванымі і неўпарадкаванымі паперамі, якія чакаюць даследчыка гісторыі нашай бацькаўшчыны»* [5, с. 117]. Вялася работа па стварэнні адмысловага каталога нясвіжскіх збораў.

Аднак пачатак Першай сусветнай вайны і наступныя падзеі змянілі лёс замка і яго гаспадараў. А над калекцыямі ў чарговы раз навісла пагроза знішчэння. Звыклы лад жыцця быў парушаны ўжо ў першыя месяцы баявых дзеянняў. У адным з замкавых карпусоў – камяніцы – абсталявалі лазарэт, які займаў 24 пакоі. Адсюль вынеслі ўсю мэблю, партрэты, знялі шоўкавыя шпалеры. Замест іх сцены атынкавалі і пабялілі. У вызваленых памяшканнях размясціліся палаты для раненых, санітарныя памяшканні, аперацыйная, ванныя пакоі і г. д. 2 верасня 1914 г. у Нясвіж з фронту прыбыла першая партыя раненых [2, с. 206].

Сур'ёзная небяспека для замка ўзнікла летам 1915 г. У адпаведнасці з тактыкай «выпаленай зямлі», якая праводзілася расійскім ваенным камандаваннем падчас вялікага адступлення, усе матэрыяльныя каштоўнасці павінны былі быць знішчаны, каб не дастацца непрыяцелю. З улікам таго, што фронт хутка набліжаўся, магчымасць спалення Нясвіжскага палаца выглядала вельмі верагоднай. Яго лёс вырашыла хадатайства графа Веляпольскага перад ваеннымі ўладамі аб захаванні замка. Па асабістым распа-

раджэнні Вярхоўнага галоўнакамандуючага ён быў узяты пад ахову [7, с. 78–79].

На працягу жніўня з Нясвіжа на захаванне ў Дзяржаўны банк у Мінску было перададзена больш за сто дакументаў, запакаваных у пяць вялікіх канвертаў. Сярод іх шлюбныя пасведчанні, дакументы аб нараджэнні, хрышчэнні і смерці прадстаўнікоў роду XIX ст., асобныя тастаменты, матэрыялы аб падзеле ардынацкай маёмасці, копіі прывілея імператара Карла V аб наданні Мікалаю Радзівілу княжацкага тытула (1547 г.) і прывілея Нясвіжу на магдэбургскае права (1586 г.), фінансавыя дакументы [10]. У тым самым месяцы пачалася эвакуацыя часткі мастацкіх твораў і калекцый. Прадметы запакоўвалі ў вялікія скрыні і везлі на чыгуначную станцыю Замір’е (Гарадзея), адкуль цягніком адпраўлялі ў Маскву.

Уяўленне пра колькасць вывезеных рэчаў даюць матэрыялы рэвіндыкцыі – вяртання культурных каштоўнасцей з Савецкай Расіі ў Польшчу, якая ажыццяўлялася ў адпаведнасці з умовамі Рыжскага мірнага пагаднення. У фондах Галоўнага архіва старажытных актаў у Варшаве (AGAD) захоўваюцца пратаколы аб прыёме ў лістападзе 1923 г. у польскай сталіцы 29 скрынак з радзівілаўскімі прадметамі, якія прыбылі рознымі цягнікамі. Усе яны ў свой час былі вывезены з Нясвіжа, да якога набліжаўся фронт.

У прыватнасці быў эвакуіраваны амаль увесь архіў. Як вынікае з матэрыялаў рэвіндыкцыі, у Польшчу вярнулася 15 скрыняў з дакументамі, якія пазначаны як «Нясвіжскі архіў» і «Нясвіжскія інвентары» [17, st. 2, 5, 6, 9, 12, 14, 27–32, 35–37]. 5 скрыняў важылі па 80 кг кожная, у дачын-

нні да 9 скрыняў вага не ўказана, але можна дапусціць, што яна была не меншай[1]. У асобную 30-кілаграмовую скрыню, верагодна, былі складзены найбольш старадаўнія і каштоўныя дакументы. Прынамсі, гэта дазваляе растлумачыць, чаму яна ацэньвалася ў два разы даражэй за астатнія. Такім чынам, можна дапусціць, што з Нясвіжа было вывезена больш за тону (каля 1150 кг) архіўных папер. Усе яны належалі да так званай «гістарычнай» часткі архіва, якая ўключала матэрыялы XVI–XIX стст. «Адміністрацыйная» частка, у якой захоўваліся гаспадарчыя дакументы, звязаныя з кіраваннем радзівілаўскімі маёнткамі, засталася на месцы.

Рыцарскія даспехі ў 1915 г. былі запакаваны ў 5 скрынак [17, st. 7, 8, 18, 25]. У адной знаходзіліся тры няпоўныя камплекты даспехаў XVII–XVIII стст., у другой – даспешны камплект, дацiроўка якога не пазначана. Яшчэ ў трох былі складзены асобныя часткі ахоўнага ўзбраення. У дакуменце яны пералічаны наступным чынам: *«панцыр вялікіх памераў, аздоблены раслінным арнаментам», «верхняя частка панцыра XV ст.», «шлемы, наплечнікі, рукавіцы, ташкі»* – агульнай колькасцю 57 адзінак, *«конская зброя»* – 5 камплектаў, фрагменты *«іспанскага даспеха арнаментаванага золатам»* – 5 адзінак[2], а таксама *«частка панцыра італьян-*

[1]Такое прыпушчэнне дазваляе зрабіць ацэначны кошт матэрыялаў. Скрыні з «Нясвіжскім архівам», якія важылі па 80 кг, і скрыні з «Нясвіжскімі інвентарамі» ацэньваюцца ў аднолькавую суму – 5 рублёў кожная.

[2]У заўвагах, зробленых у 1923 г., пазначана, што часткі гэтага даспеха захоўваюцца ў Венскім музеі. На сённяшні момант у Музеі гісторыі мастацтваў у Вене знаходзіцца аздоблены эмаллю і пазалотай парадны даспех Мікалая Радзівіла Чорнага (Германія, сярэдзіна XVI ст.) Ён быў перададзены эрцгерцагу Фердынанду II у 1580 г. і з таго часу не пакідаў тэрыторыі сучаснай Аўстрыі. Магчыма, для Чорнага было зроблена некалькі камплектаў параднай зброі, адзін з якіх у 1915 г. і эвакуіравалі з Нясвіжа.

*скай работы і 6 дробных фрагментаў гэтага даспеха»,* якія датуюцца XV ст.

У трох скрынях знаходзіліся карціны і гравюры разнастайнай тэматыкі [17, st. 13, 15, 23]. У прыватнасці, партрэты Януша Радзівіла сярэдзіны XVII ст. (работы В. Гондзіюса), Марыі Дароты Радзівіл дэ Кастэлян, князя Альбрэхта Радзівіла і тры дзіцячыя партрэты пэндзля В. Папэ; 31 *«карціна ўласнага пэндзля»* – пейзажы, замалёўкі, эскізы, аўтарам якіх мог быць нехта з князёў Радзівілаў; 8 ілюстрацый Міхала Эльвіры Андрыёлі да паэмы «Пан Тадэуш» (малюнкі пастэллю, фарбаваныя гуашшу і акварэллю); 20 работ Юльяна Фалата, сярод якіх паляўнічыя замалёўкі, партрэты Ежы Радзівіла і кронпрынца Вільгельма Гогенцолерна. Асобна ў гэтым пераліку значыцца мастацкі альбом, прысвечаны паляванню з удзелам кронпрынца, якое адбылося ў лютым 1886 г. – «Souvenir de la chasse a L'oure a Nieswiez on l honour de son Altesse Royale le Prince Wuillaime de Prusse chez son Altesse le Prince Antoine Radziwill»; 21 англійская каляровая гравюра і адна польская. Сярод іншага былі вывезены і дзве папкі з замалёўкамі І. Урублеўскага, а таксама яго асобныя малюнкі алоўкам – *«партрэты службоўцаў лясной варты і галовы аленяў»*[1].

Яшчэ дзве карціны, аўтарства і характар якіх не пазначаны, знаходзіліся ў асобнай скрыні разам з кнігамі (*«каля 200 тамоў у пераплётах»*) і сямейнымі фотаздымкамі. Фотаздымкі займалі і асобную скрыню, верагодна, не надта вялікую па памерах [17, st. 33].

[1]У 2016 г. музей-запаведнік «Нясвіж» набыў адну работу І. Урублеўскага «Партрэт Кастуся Туруля», напісаны ў Нясвіжскім замку ў 1915 г.

У адну скрыню былі складзены пяць набораў сталовага посуду, кожны з якіх налічваў дзясяткі прадметаў [17, st. 10]. У чатыры наборы, агульнай вагой каля 29 кг, уваходзілі сярэбраныя прадметы (талеркі, нажы, відэльцы, лыжкі, вялікія і малыя кубкі), многія з якіх былі пакрытыя пазалотай. Пяты сталовы прыбор на 24 асобы быў некалі зроблены ў Берліне па заказу Георга Радзівіла, аб чым сведчыла манаграма «G.R» на відельцах, лыжачках, нажах.

У астатнія тры скрыні былі спакаваны прадметы рознага характару: посуд, зброя, падсвечнікі, парцалянавыя статуэткі і вазы [17, st. 3, 17, 21]. Сярод іх часткі кандэлябраў і падсвечнікаў агульнай вагой каля 80 кг, тры камплекты дуэльных пісталетаў, клінок з надпісам «Mater dei ora pronobis» (Маці Божая, маліся за нас), ёмкасці для воцату і алею, школьны атлас сярэдзіны XVIII ст. з каляровымі ручнымі гравюрамі ў скураным пераплёце і інш. У якасці найбольш каштоўных пазначаны *«2 камінныя вазы з аметыста, арнаментаваныя бронзай», «парцалянавая белая ваза з профілем і ініцыяламі Станіслава Аўгуста», «парцалянавая берлінская ваза з ручкамі ў выглядзе казліных галоў».* Як вынікае з дакументаў рэвіндыкцыі, гэтыя прадметы паспяхова перачакалі ваенныя і рэвалюцыйныя падзеі і былі вернуты гаспадарам.

Аднак такі шчаслівы лёс напаткаў не ўсе эвакуіраваныя каштоўнасці. Сярод дакументаў AGAD захоўваецца «Пратакол аб страце груза», складзены 7 кастрычніка 1915 г. службоўцамі станцыі «Масква таварная» Аляксандраўскай чыгункі [17, st. 54–56]. З яго вынікае, што на платформе № 430797, адпраўленай з Замір'я 7 верасня 1915 г., знаход-

зяцца тры скрыні *«старадаўніх мастацкіх прадметаў»* агульнай вагой 35 пудоў, у той час як па дакументах было адпраўлена 13 скрыняў агульнай вагой 80 пудоў. Куды за месяц зніклі 10 скрыняў старадаўніх рэчаў, якія важылі больш за 700 кг, і ці былі яны ўрэшце знойдзены, на сённяшні момант адказаць цяжка. На гэтай жа платформе ў Маскву прыбылі чатыры старадаўнія бронзавыя гарматы, адпраўленыя з Нясвіжа.

Такім чынам, можна канстатаваць, што ў глыб імперыі, далей ад лініі фронта, былі вывезены амаль увесь архіў (за выключэннем бягучай дакументацыі), калекцыя даспехаў (прынамсі, найбольш каштоўная яе частка), некаторыя жывапісныя творы, сталовыя сервізы, гарматы і разрозненыя старадаўнія рэчы, сямейныя фотаздымкі. Разам з тым у палацы засталася бібліятэка, партрэтная галерэя, скульптуры і габелены, калекцыя паляўнічых трафеяў, старадаўняя мэбля, значная колькасць сталовага посуду, парцалянавыя вырабы, жырандолі. Няма згадак і пра эвакуацыю нумізматычнай калекцыі.

З вясны 1917 г. у Нясвіжы пачалася частая змена ўлады, якая скончылася толькі восенню 1920 г., калі горад увайшоў у склад аднаўленай польскай дзяржавы. За гэты час нясвіжане перажылі перыяд кіравання Часовага ўрада, які характарызаваўся нарастаючым хаосам, нямецкую акупацыю 1918 г., тройчы (у 1917, 1918 і 1920 гг.) у горадзе ўсталёўвалася савецкая ўлада, двойчы (у 1919 і 1920 гг.) яго займалі польскія войскі. Нягледзячы на тое, што Радзівілы пакінулі сваю рэзідэнцыю яшчэ восенню 1917 г., кожная ўлада ў той ці іншай ступені дэкларавала апеку над палацам і яго маёмасцю.

Так, сход вайскоўцаў-беларусаў 2-й арміі Заходняга фронту, які праходзіў у замку 1–4 снежня 1917 г., прыняў адмысловую рэзалюцыю, у якой асобным пунктам утрымліваўся зварот да армейскай Беларускай Рады узяць пад сваю апеку *«бібліятэку князя Радзівіла, як нацыянальны набытак Беларусі».* У самім замку, на думку дэлегатаў, меўся быць адкрыты сельскагаспадарчы інстытут [14]. Аднак праз слабасць нацыянальнага руху і адсутнасць належных сродкаў гэтыя заклікі не былі ўвасоблены ў жыццё. Да таго ж неўзабаве Нясвіж быў заняты нямецкімі войскамі.

Эдвард Вайніловіч у сваіх мемуарах сведчыць, што ў палацы пасяліўся палкоўнік Ф. Тэтлау, які паводзіў сябе нібы ва ўласным доме. Аднак Вільгельм II не забыўся, што Радзівілы некалі займалі важнае месца пры берлінскім двары, і пра тое, як сам прыязджаў да іх на паляванне. Ён некалькі разоў спецыяльнымі тэлеграмамі нагадваў ваенным уладам аб неабходнасці не прычыняць шкоды палацу і радзівілаўскай пахавальні ў касцёле [1, с. 125, 251].

Паўторнае ўсталяванне савецкай улады ў снежні 1918 г. адзначылася непрыемнымі эксцэсамі. Пасля адыходу немцаў у Нясвіж прыбыў атрад Надзвычайнай камісіі Смаленскай акругі пад камандаваннем нейкага Салдатава. Апошні размясціўся ў замку і павёў сябе як удзельны князь часоў сярэднявечча. На горад была накладзена кантрыбуцыя, пачаліся масавыя арышты. Калі мясцовы рэўкам сабраўся на пасяджэнне для абмеркавання паводзін прышлых чэкістаў, Салдатаў загадаў акружыць будынак і, пад пагрозай кулямётаў, распусціў сход. У студзені 1919 г. з дапамогай рэгулярнай арміі атрад Салдатава нарэшце ўдалося раззброіць.

Камандзіра разам з паплечнікамі аддалі пад суд, арыштаваных выпусцілі, а кантрыбуцыя, сабраная з горада, нібыта растаяла ў паветры [12]. Следчая камісія высветліла, што за час гаспадарання Салдатава з замка зніклі многія каштоўныя рэчы, творы мастацтва, габелены, кошт якіх не падлягае ацэнцы. Карэспандэнт газеты «Звезда» А. Панасін даволі жорстка ацаніў дзеянні чэкістаў, назваўшы іх людзьмі, якія толькі выглядаюць сваімі, а на справе *«чужыя не толькі нам, але і нашаму веку, нашым уяўленням пра дабро і зло, пра культуру і права»* [12].

Вынікам інцыдэнту стаў рост увагі да былой княжацкай рэзідэнцыі. Пакоі апячаталі. З ліку жаўнераў 9-га пагранічнага палка прызначылі ахову ў колькасці 14 чалавек, а таксама з'явілася пасада каменданта замка. Але на ацяпленне залаў сродкаў не знайшлося, і каштоўныя творы жывапісу «зімавалі» ў халодных памяшканнях, што не лепшым чынам адбілася на іх захаванасці.

30 студзеня 1919 г. часовы рабоча-сялянскі ўрад Беларусі выдаў пастанову за подпісам старшыні З. Жылуновіча і народнага камісара асветы А. Чарвякова аб уліку і ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей. Паводле яе органы міліцыі былі абавязаны прыняць усе меры па захаванні помнікаў гісторыі, а надзвычайныя камісіі мусілі тэрмінова ўжыць захады супраць вінаватых у раскраданні і неналежным абыходжанні з культурнай спадчынай. Цэнтрам, які каардынаваў дзейнасць па выяўленні, збіранні і захаванні культурных каштоўнасцей, стаў Народны камісарыят асветы [4]. Неўзабаве было вырашана стварыць у Мінску музей, у якім павінны быць сабраны *«ўсе каштоўныя*

*мастацкія рэчы, якія кінула збеглая буржуазія»* [8]. Для выяўлення і адбору патэнцыяльных экспанатаў у маёнткі і рэзідэнцыі Мінскай губерніі разасланы спецыялісты наркамата асветы (у традыцыях тых гадоў іх называлі «археолагамі»).

9 лютага ў Нясвіж прыбыў інструктар Беларускага музея Л. Замкоў. У дакладной запісцы, складзенай пасля агляду замка, ён канстатаваў, што заспеў у памяшканнях *«хаос і пашкоджанні»*, а таксама – *«мноства знішчаных старадаўніх прадметаў мастацтва»*, паўсюль валяліся аскепкі каштоўнага посуду XVIII ст., са сцен былі сарваныя шоўкавыя шпалеры [3]. Разам з тым Л. Замкоў адзначаў, што самі будынкі знаходзяцца ў адносна добрым стане, нягледзячы на выбітыя вокны. Захавалася французская мэбля і фарфор, старадаўнія жырандолі, архіўныя дакументы, кнігі, карціны. Унікальных прадметаў было так многа, што «археолаг» паставіў слушнае пытанне: ці трэба перадаваць усё гэта ў мінскі музей? Можа, лепш пакінуць часова на месцы, пакуль не высветліцца далейшы лёс замка? Разам з тым, ён паклапаціўся пра стварэнне пастаяннай аховы з ліку вольнанаёмных і пачаў пошукі супрацоўніка, які мог бы заняцца зборам прадметаў мастацтва ў Нясвіжы і ваколіцах [3].

Вынікі камандзіроўкі Л. Замкова разглядаліся на пасяджэнні калегіі Народнага камісарыята асветы 4 сакавіка 1919 г. Член калегіі Іваноўскі прапанаваў стварыць у замку асобны музей, дзе можна пакінуць найбольш каштоўныя прадметы, а астатнія перадаць іншым камісарыятам. Радзівілаўскі архіў было прапанавана перавезці ў Мінск. Адзначалася, што ён *«стане аздобай Краёвай бібліятэкі, якая*

*будзе знаходзіцца пры Мінскім універсітэце»* [13, с. 51]. Як вынікае, у Наркамаце не ведалі, што большая частка «архіва Вялікага Княства Літоўскага» эвакуіравана ў Расію.

Цікавае супадзенне: у той самы дзень, 4 сакавіка, у газеце «Звезда» з'явіўся артыкул спецыяльнага карэспандэнта А. Панасіна, які прапанаваў свой погляд на будучыню палаца: *«Вось каб у 400 пакоях замка стварыць вышэйшую навучальную ўстанову, напрыклад сельскагаспадарчы інстытут. Гэта было б больш чым да месца. Падумайце: у маёнтку пры замку дванаццаціпольная сістэма гаспадарання, выдатная племянная свойская жывёла самых лепшых парод, рыбаводства (залатыя карпы), разнастайныя сельскагаспадарчыя машыны самых новых сістэм, велізарныя абшары зямлі, узорная лясная гаспадарка, аранжарэі. Адным словам, усё спрыяе таму, каб тут была адкрыта вышэйшая сельскагаспадарчая школа. Навуковыя сілы знойдуцца: можна перавесці з якога-небудзь інстытута, які спыніў дзейнасць. Можа дапамагчы мясцовае насельніцтва, якое ў ваколіцах трывала стаіць на нагах. Гэта – захапляльная, светлая легенда, якая заменіць дзесяткі старых. Але легенда будучыні, і, здаецца, далёкай будучыні»* [12].

Са сродкаў Наркамата асветы на рамонт і ахову палаца было выдзелена 50 000 рублёў. У Нясвіжы паўстаў камітэт па доглядзе замка. У яго ўвайшлі прадстаўнікі выканкама і аддзела народнай адукацыі, а таксама дырэктар мясцовай польскай гімназіі прафесар Мар'ян Масоніус і былы радзівілаўскі архіварыус Кляйншнэп. Апошняга характарызавалі, як *«вялікага знаўцу даўніны, вельмі сумленнага і прыстойнага чалавека»*. Цікава, што, хаця абодва спецыялісты

прытрымліваліся поглядаў адрозных ад савецкай ідэалогіі (і гэта ні для каго не было сакрэтам), прадстаўнікі ўлады вырашылі звярнуцца да іх паслуг, як да прафесіяналаў [13, с. 51]. Ахоўная служба складалася з каменданта Пятра Шкляржа і пяці вартаўнікоў, якія павінны былі даглядаць замак і прылеглы да яго парк. На яе ўтрыманне быў складзены асобны каштарыс выдаткаў, куды ўваходзілі зарплата каменданта і ахоўнікаў, набыццё для іх гаспадарчых і канцылярскіх прылад, ацяпленне вартоўні і каменданцкага пакоя. Штомесяц на гэта выдаткоўвалася каля 6000 рублёў. Грошы выдзяляліся з сумы, асігнаванай на стварэнне абласнога музея [15].

Усе гэтыя захады ажыццяўляліся ва ўмовах вайны. З сакавіка 1919 г. Нясвіж фактычна з’яўляўся прыфрантавым горадам. Летам баі ішлі за некалькі кіламетраў ад яго ўскраін. Натуральна, што ў такіх умовах пытанні аховы культурнай спадчыны адступалі на другі план. А 6 жніўня ў горад увайшлі польскія аддзелы.

У маім распараджэнні няма дакументаў, якія б пралівалі святло на лёс замкавых каштоўнасцей у перыяд польскага панавання (жнівень 1919 – ліпень 1920 г). Мяркуючы па тым, што ў гэты час у Нясвіжы эпізадычна з’яўляўся Альбрэхт Антоній Радзівіл[1], можна дапусціць, што ім былі зроблены неабходныя захады для іх лепшага захавання. Нейкая частка рэчаў магла быць эвакуіравана на захад. Р. Афтаназы пісаў пра вываз у Варшаву архіва [16, s. 297], але ён па-

[1]Нясвіжскі ардынат вярнуўся з Парыжа ў верасні 1919 г. У сваёй рэзідэнцыі ён знаходзіўся і вясной 1920 г. Хутчэй за ўсё, Альбрэхт прысутнічаў у Нясвіжы 25 мая 1920 г., калі ў касцёльнай крыпце адбылося пахаванне яго дзядзькі Станіслава Радзівіла [1, с. 296, 306, 314].

мыляўся. Як ужо адзначалася, архіў у гэты час знаходзіўся ў Маскве.

Пасля чарговага, трэцяга па ліку, усталявання савецкай улады ў ліпені 1920 г. яе прадстаўнікі зноў звярнулі ўвагу на княжацкі палац. 18 ліпеня быў выдадзены загад аб захаванні маёмасці на тэрыторыі, падпарадкаванай Нясвіжскаму ваенна-рэвалюцыйнаму камітэту. У верасні 1920 г. быў складзены «Вопіс рэчаў у б[ылым] замку б[ылых] кн[язёў] Радзівілаў» [11]. У свой час з гэтым дакументам працавалі Таццяна і Уладзімір Пярвышыны [13]. Мастацтвазнаўца Т. Карповіч адзначала, што інвентар не ўяўляе цікавасці для даследчыкаў, паколькі *«ў ім не акцэнтавана ўвага на творах мастацтва, не ўказаны іх назвы, памеры і матэрыял»* [6, с. 17]. Сапраўды, з дакументаў падобнага кшталту вопіс 1920 г., напэўна, самы незвычайны. Яго складальнікі паставілі сабе мэту падлічыць і зафіксаваць усю маёмасць, якая знаходзілася ў падвале, пакоях палаца, на гарышчы і ў надворных гаспадарчых пабудовах. Усяго – 173 памяшканні[1]. Пакоі пазначаны толькі нумарамі, без удакладнення размяшчэння на паверсе, таму цяжка іх суаднесці з сённяшнімі заламі.

Маёмасць *«былога княжацкага палаца»* ахарактарызавана паводле сямі катэгорый, звесткі па якіх прадстаўлены ў выглядзе табліцы: *«№ прадмета па парадку», «месцазнаходжанне* (нумар памяшкання – А.Б.)», *«назва прадметаў», «колькасць прадметаў», «стан прадметаў», «ці маюць яны*

[1]Усяго ў інвентары пералічана 157 пакояў, з іх 14 (№№ 16, 27, 31, 46, 48, 52, 53, 61, 63, 87, 97, 126, 137, 138) зафіксаваны пад падвойнай нумарацыяй – пакой 16а і 16б, 27а і 27б і г.д., пакой № 64 – пад патройнай 64а, 64б, 64в. Магчыма, гаворка ідзе пра сумежныя памяшканні.

*мастацкую, гістарычную або іншую каштоўнасць», «заўвагі».* Запісы ў гэтых раздзелах надзвычай лаканічныя. Назва прадмета зачастую абмяжоўваецца адным-двума словамі: *«лямпа», «табурэт», «стол», «бутэлькі», «вешалка», «шафа кніжная», «лямпа-жырандоля»* [11, арк. 12адв]. Пры гэтым няма ні дацiроўкі, ні характарыстыкі прадмета. У выпадках з кнігамі, карцінамі, бюстамі іх назвы не згадваюцца. Стан прадметаў у большасці выпадкаў характарызуецца словамі *«цэлы»* або *«сапсаваны».* Няясна, на падставе чаго вызначалася, ці маюць прадметы нейкую каштоўнасць (*«ценность»*). Запісы ў гэтай графе даволі разнастайныя: *«не»* (не мае каштоўнасці – А. Б.), *«так»* (прадмет уяўляе цікавасць – А. Б.), *«мае каштоўнасць», «каштоўны» («ценный»), «маст[ацкая] каштоўнасць», «гіст[арычная] каштоўнасць», «навук[овая] каштоўнасць», «культ[урная] каштоўнасць», «замк[авая] каштоўнасць», «муз[ейная] каштоўнасць».* Графа «заўвагі» ў абсалютнай большасці выпадкаў незапоўненая. Толькі рэдка ў ёй зроблены пазнакі кшталту *«шафка… старадаўняя»* [11, арк. 30], якія мала што дадаюць да характарыстыкі прадмета.

Усяго вопіс уключае 1535 пазіцый-нумароў[1]. Пры гэтым пад адным нумарам можа быць запісаны як асобны прадмет, так і некалькі адзінак, а часам дзясяткі і сотні. Напрыклад, пад № 8 у першым падвальным памяшканні пазначаны *«бутэлькі – блізу 1500»* [11, арк. 1адв]. Пад № 547 у пакоі № 99 – *«талеркі – 54, адна разбітая, мастацкая каштоўнасць»* [11, арк. 21адв]. Падыход скла-

[1]Складальнікамі вопіса прапушчаны №№ 368–387 і пасля № 367 адразу ідзе № 388. Таксама прапушчаны № 599, двойчы запісаны № 572 (572а і 572б) [11, арк. 18адв–19, 22, 23].

дальнікаў да работы ўражвае. Часам яны праяўляюць надзвычайную скрупулёзнасць, фіксуючы самыя нязначныя рэчы: *«клунак лахманоў – 1»*, *«куча паперы – 1»*, *«скрынкі з-пад віна – 17»*, *«цэбар («ушат») з хламам – 1»* [11, арк. 2адв, 3, 4, 4адв]. Усё названае знаходзілася ў адным пакоі і не мела ніякай каштоўнасці. У пералік уключаны 62 палены дроваў, дзве запасныя шыны для веласіпеда, накрыўка ад друкарскай машынкі [11, арк. 6адв, 22] і многія іншыя рэчы падобнага кшталту. Пры гэтым дакументы, карціны, кнігі характарызуюцца надзвычай адвольна. Так, у пакоі № 82 (другі паверх палаца) пазначаны 11 цэлых карцін і 11 цэлых статуй. З «Вопісу…» можна даведацца толькі, што яны маюць каштоўнасць [11, арк. 19]. У пакоі № 101 (другі паверх палаца) у шафе з пабітым шклом знаходзілася *«калекцыя жалезных рэчаў»* [11, арк. 23адв]. Што гэта за рэчы і колькі іх было – сказаць немагчыма. Відавочна, складальнікам вопісу бракавала спецыяльных ведаў, а магчыма – часу і жадання, займацца такой карпатлівай работай.

Вызначаючы каштоўнасць прадмета, яны кіраваліся сваімі суб'ектыўнымі ўяўленнямі і, напэўна, знешнім выглядам рэчы. Натуральна, што сапраўдная гісторыка-культурная вартасць наўрад ці ўлічвалася. Напрыклад, да прадметаў, якія маюць *«мастацкую, гістарычную або іншую каштоўнасць»,* аднесены гамак, два кавалкі лінолеума, прабірка і шкала ад тэрмометра, зламаная пралка, два вогнетушыльнікі [11, арк. 3, 10адв, 23адв, 32]. Усё гэта вымушае вельмі асцярожна ставіцца да звестак вопісу. І тым не менш, гэта адзіная крыніца, якая фіксуе стан радзівілаўскага зам-

ка ў той складаны перыяд, ігнараваць дадзеныя якой было б няправільна.

Найперш заўважаецца, што 13 пакояў пазначаны як абсалютна пустыя. У іх няма нічога: ні мэблі, ні карцін, ні нават куч смецця. Некаторыя прадметы былі запакаваны і, відавочна, падрыхтаваны да вывазу. У падвальным памяшканні знаходзіліся дзевяць скрынак *«з панцырамі»*, пад якімі можна разумець часткі даспехаў. У пакоі другога паверха камісія ўбачыла запакаваны раяль, стол, шафу, скрынку з карцінамі, дзвве скрынкі з альбомамі, кнігамі і паперамі, складзенымі ўперамешку, 12 закрытых скрынак, змесціва якіх мела *«мастацкую каштоўнасць»*. Яшчэ адну разабраную шафу, якая знаходзілася тут жа, запакаваць не паспелі. У суседніх пакоях аказаліся дзве скрынкі з кнігамі і тры з мастацкімі рэчамі, а пяць скрынак з каштоўнай мэбляй (відавочна, разабранай – *А. Б.*) захоўваліся ў надворных пабудовах [11, арк. 4адв, 24–24адв., 30адв.].

Айчынны даследчык А. Мальдзіс, які адмыслова займаўся лёсам беларускіх культурных скарбаў, у адной з публікацый пісаў, што пры адступленні польскага войска ў 1920 г., па ініцыятыве «Stowarzyszenia miłośników ziemi Mińskiej» на захад было вывезена 36 000 (!) скрынак кніг, дакументаў, карцін і музейных рэчаў са шляхецкіх сядзіб і прыватных збораў [9]. Сярод іх, цалкам верагодна, знаходзіліся прадметы і з радзівілаўскага Нясвіжа. Вышэйназваныя рэчы маглі прызначацца для транспарціроўкі за Буг, але эвакуіраваць іх не паспелі.

У замку ўсё яшчэ заставалася немалая калекцыя мастацкіх твораў. Вопіс адзначае наяўнасць 10 ікон, 62 партрэтаў,

168 карцін (16 з іх «не ўяўлялі каштоўнасці»), 62 гравюр, 20 статуй, 21 статуэткі, 11 бюстаў (адзін з іх, гліняны, не меў «каштоўнасці»). Усе яны былі раскіданы па памяшканнях у невялікай колькасці. Акрамя таго, у розных пакоях знаходзіліся ўжо названыя скрынка з карцінамі, *«звязаныя карціны»* (верагодна, сувой палотнаў) і 59 гравюр, карцін, фотаздымкаў, запісаных пад адным нумарам. Яшчэ 15 карцін і фотаздымкаў знаходзіліся ў падвале [11, арк. 2]. Яны былі пазначаны разам, як прадметы, што не маюць ніякай вартасці. Таксама згадваецца *«металічны арол»* (не ясна – падсвечнік ці асобная скульптура) і нейкая *«дошка з выявай герояў»* [11, арк. 23адв]. Да мастацкай калекцыі можна аднесці і тры генеалагічныя табліцы, вызначаныя як *«радаслоўныя карты»*. Напэўна, гаворка ідзе пра па-мастацку выкананыя «Родавыя дрэвы Радзівілаў», надрукаваныя ў XVIII ст. Усе прадметы захаваліся ў даволі добрым стане, калі не лічыць разбітага шкла ў рамах некаторых карцін. Вопіс адзначае, што папсаваныя толькі дзве іконы, тры партрэты, адна статуя (адбітыя ад яе металічныя часткі валяліся побач) і адзін бюст (адбіты твар).

Бібліятэка не мела адзінага памяшкання. Кнігі былі раскіданы па многіх пакоях. Вопіс адзначае наяўнасць у замку 59 кніжных шафаў, але не заўсёды ўказана, ці знаходзілася нешта на іх паліцах. Так, у 19 выпадках проста запісаны *«шафы для кніг»* без ніякіх пазнак пра іх змесціва. У адным выпадку можна дапусціць, што ў шафе знаходзіліся 257 кніг і 13 часопісаў на нямецкай мове [11, арк. 10адв.]. Згадана таксама 14 шафаў з кнігамі, дзве шафы з кнігамі і сшыткамі і 11 шафаў з кнігамі і дакументамі. Гэтыя апошнія знаходзіліся ў адным пакоі [11, арк. 23адв.]. Яшчэ дзевяць кніжных шафаў стаялі ў

пакоі № 99[1]. У шасці з іх было падлічана 354 асобнікі. Яшчэ ў адной колькасць кніг вызначылі на вока – *«блізу 200»*. У іншай шафе знаходзілася *«нявызначаная колькасць»* кніг, а ў апошняй – *«паперы і спісаныя кнігі»*, па ўсёй верагоднасці канцылярскія. Побач з шафамі, у гэтым жа пакоі, складальнікі зафіксавалі тры *«кучы польскіх і замежных кніг»* [11, арк. 21, 22адв]. У пакоі № 97а былі дзве шафы, а ў іх 160 кніг. У пакоі № 135 шафа з 220 кнігамі [11, арк. 20адв., 29]. 116 кніг на рускай, польскай, англійскай і *«замежных мовах»* былі раскіданы па памяшканнях першага і другога паверхаў. Часам па адной-дзве, а часам – па некалькі дзясяткаў. Толькі ў дзвюх выпадках пазначана тэматыка выданняў: *«польскі падручнік гігіены»* і *«кніга гістарычная»* [11, арк. 2адв., 17]. У якасці прадметаў, што не маюць ніякай каштоўнасці, запісаны кошык з кнігамі, а таксама *«кнігі на сталах, якія нельга падлічыць»* у пакоі № 100 [11, арк. 23]. Не трэба забывацца і пра названыя вышэй запакаваныя скрынкі. Мінімальную колькасць кніг, якія засталіся ў палацы, можна вызначыць недзе ў 1500–2000 асобнікаў. Паводле Р. Афтаназы, перад Першай сусветнай вайной радзівілаўская бібліятэка налічвала каля 10 000 тамоў [16, s. 297]. Як мы ўжо бачылі, у Маскву была эвакуіравана толькі малая яе частка. Верагодна, нямала кніг загінулі або пакінулі замак падчас падзей 1917–1920 гг. Да набыткаў бібліятэкі варта залічыць некалькі нотных зборнікаў і блізу 20 карт, якія заставаліся ў Нясвіжы ў 1920 г.

Дакументы, як і кнігі, былі раскіданы па розных залах. Вопіс адзначае ў пакоі № 99 каля кніжных шафаў пяць *«кучаў*

[1]Мяркуючы па наяўнасці ў гэтым жа памяшканні шасці бюстаў, можна дапусціць, што гаворка ідзе пра цяперашнюю музейную залу «Гісторыя бібліятэкі і архіва». Менавіта тут на шафах стаялі мармуровыя бюсты антычных філосафаў [16, s. 297].

*канцылярскіх кніг»*, у суседнім памяшканні – чатыры шафы з архіўнымі справамі [11, арк. 22адв., 20адв]. У розных пакоях былі ўлічаны 17 вялікіх інвентарных кніг (некаторыя чыстыя, некаторыя спісаныя), 93 спісаныя бухгалтарскія і квітанцыйныя кнігі, па 129 канцылярскіх і квітанцыйных кніг, а таксама *«бухгалтарская кніга-журнал у скураным пераплёце»*. Акрамя гэтага згадваюцца *«куча папер»*, чатыры куфры з канцылярскімі справамі і дзелавымі кнігамі, кошык з планамі, шафка з бухгалтарскімі кнігамі, *«паперы дзелавыя»* ў папках і шуфлядах сталоў.

Калекцыя паляўнічых трафеяў была прадстаўлена рагамі аленяў, якіх налічвалася каля сотні, у дзвюх пакоях другога і трэцяга паверхаў. Частка рагоў спакавана ў скрынкі, дзе іх ніхто не падлічваў. Таксама ў палацы заставаліся чучалы двух галоў аленяў, двух казіных галоў і адной галавы мядзведзя. Рэшткі калекцыі ўзбраення і даспехаў, як адзначалася вышэй, былі падрыхтаваны да вывазу. Акрамя рэчаў, запакаваных у скрынкі, з прадметаў падобнага кшталту названы толькі папсаваны *«фрагмент кальчугі»* і *«футарал* (похвы – *А. Б.*) *для шпагі»* [11, арк. 23]. Ніводнай адзінкі зброі, мастацкай ці паляўнічай, у дакуменце не згадана. Няясны лёс манетна-медальнай калекцыі. У вопісе адзначана наяўнасць пяці скрынак для манет, якія маюць *«музейную каштоўнасць»* [11, арк. 9], але не ўдакладняецца, ці былі ў іх манеты.

Да каштоўных рэчаў аднесена вялікая колькасць мэблі: крэслы, фатэлі, канапы, ложкі, шырмы, шафы, камоды, буфеты, этажэркі, падстаўкі. Адных толькі сталоў і столікаў – каля 90 адзінак. Сярод іх начныя, туалетныя, пісьмовыя,

аптэчны; вялікія і малыя; паўкруглыя, круглыя і васьмівугольныя; з чорнага і чырвонага дрэва; са звычайнымі і мармуровымі сталешніцамі. У гэты ж пералік уваходзяць тры адмысловыя шахматныя і тры ломберныя столікі[1]. У замку знаходзіліся і два більярдныя сталы *«з абадраным сукном»*, і стойка для більярдных кіёў, але яны, на думку ўкладальнікаў вопісу, цікавасці не ўяўлялі.

Мастацкую вартасць мелі восем гадзіннікаў (адзін з іх без маятніка)[2], два крыжа, дзве шахматныя дошкі (адна з іх мармуровая), тры раялі[3] (гэта адзіныя музычныя інструменты, згаданыя ў дакуменце), пяць попельніц, дзве карэты і пяць саней, якія стаялі ў вазоўні. *«Шкляная піраміда»* (?!) была аднесена да *«музейных каштоўнасцяў»*. «Вопіс…» згадвае вялікую колькасць па-мастацку выкананых падставак, рамак і багетаў, падсвечнікаў, сталовага посуду, парцалянавых вырабаў (вазы, тазы, блюды, гарлачы, вёдры, фарфоравыя птушкі і букеты), некалькі жырандоляў і іх часткі.

Такім чынам, можна канстатаваць, што, нягледзячы на спусташэнні ваеннага часу і частыя змены ўлады, у Нясвіжскім палацы захавалася вялікая колькасць прадметаў, якія маглі б стаць аздобай любога музея. Сярод іх кнігі, карціны, посуд, мэбля. Улічваючы, што ў кастрычніку 1920 г. у Нясвіж зноў увайшлі польскія аддзелы, можна дапусціць, што ўсе гэтыя рэчы заставаліся ў замку да чарговай змены ўлады.

---

[1]Яшчэ пяць ломберных столікаў і столік для карт не патрапілі ў лік прадметаў, якія маюць «мастацкую, гістарычную або іншую каштоўнасць».

[2]Да ліку прадметаў, якія не маюць каштоўнасці, аднесены адзін гадзіннік і гадзіннікавы механізм.

[3]Яшчэ адзін раяль «каштоўнасці» не меў.

Прынамсі, звестак пра іх вываз, знішчэнне, перадачу іншым установам у маім распараджэнні няма.

Падсумоўваючы вышэйсказанае, можна канстатаваць, што ваенныя падзеі 1914–1920 гг. сталі для Нясвіжскага замка не такімі спусташальнымі, як у 1706 і 1812 гг., калі ён быў захоплены шведскімі і расійскімі войскамі адпаведна. Нягледзячы на змены гаспадароў замак пазбег татальнага рабавання. Гэтаму спрыялі своечасовыя захады па эвакуацыі найбольш каштоўных прадметаў, якія былі вывезены ў глыб Расійскай імперыі і вернуты пасля канчатковага ўсталявання савецка-польскай мяжы. На лёс княжацкай рэзідэнцыі паўплывала блізкасць Радзівілаў да расійскага і нямецкага правячых дамоў. У першым выпадку гэта дапамагло ўратаваць замак ад разбурэння, у другім – забяспечыла захаванасць яго збораў падчас нямецкай акупацыі.

Найбольшыя страты падчас ваенных і рэвалюцыйных падзей панесла замкавая бібліятэка. Таксама былі знішчаны многія прадметы паўсядзённага карыстання (мэбля, сталовы посуд), значна пашкоджаны шоўкавыя шпалеры на сценах рэпрэзентацыйных залаў. Нягледзячы на гэта вялікая колькасць мастацкіх рэчаў засталася на сваіх месцах.

У перыяд рэвалюцыі было пастаўлена пытанне аб нацыяналізацыі замка і далейшым лёсе ягоных калекцый. У 1919 г. упершыню прагучала прапанова аб стварэнні на аснове радзівілаўскіх збораў агульнадаступнага музея, але да практычнай яе рэалізацыі справа не дайшла. У якасці цікавага эпізоду можна разглядаць прапановы па стварэнні ў палацы сельскагаспадарчага інстытута.

## Крыніцы і літаратура


1. Войнилович, Э. Воспоминания / Э. Войнилович – Минск, 2007. – 380 с.
2. Волкава, В. Лазарэт Чырвонага Крыжа князёў Радзівілаў у Нясвіжскім замку ў гады Першай сусветнай вайны / В. Волкава // Прыватнаўласніцкія гарады Вялікага Княства Літоўскага: лёс праз стагоддзі : мат-лы міжнар. навук.-практ. канферэнцыі. Нясвіж 23–24 красавіка 2014 г. / рэд. кал. : С. М. Клімаў, З. Л. Яцкевіч, А. У. Блінец – Мінск : Выдавец А. Янушкевіч, 2014. – С. 205–214.
3. Дакладная запіска інструктара Беларускага музея Л. Замкова па праверцы Нясвіжскага замка // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Нясвіжскага раёна / рэд. кал. : г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2001. – С. 131.
4. Декреты и постановления правительства // Звезда – 1919. – 31 января (№ 361) – С. 4.
5. Ельскі, А. Нясвіж Радзівілаў чвэрць стагоддзя назад і сёння / А. Ельскі // Выбранае / А. Ельскі – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. – С. 107–118.
6. Карпович, Т. Судьбы несвижской коллекции в первой половине XX века / Т. Карпович // Бюлетэнь Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. – Минск, 2002. – С. 15–17.
7. Князева, В. У складзе Расійскай імперыі / А. Князева // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Нясвіжскага раёна / рэд. кал. : г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2001. – С. 70–79.
8. Краевой музей и художественная выставка // Звезда – 1919. – 15 февраля (№ 374) – С. 4.
9. Мальдис, А. А что же дальше? / А. Мальдис // СБ. Беларусь сегодня. – 2008. – 1 ноября – С. 19.

10. Описи семейных документов, акций и финансовых документов князей Радзивиллов, которые подлежат передаче на хранение в Государственный банк в Минске // Национальный исторический архив Беларуси (НИАБ) – Ф. 694 – Оп. 1 – Д. 223. – Лл. 1–10.
11. Опись вещей в б. замке б. кн. Радзивилллов // Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ) – Ф. 42 – Оп. 1 – Д. 6 – Лл. 1–31.
12. Панасин, А. Красная Белоруссия. Новые легенды / А. Панасин // Звезда – 1919. – 4 марта (№ 388) – С. 2.
13. Пярвышын, У., Пярвышына, Т. З нядаўняе гісторыі Нясвіжскага замка / У. Пярвышын, Т. Пярвышына // Нясвіж: гісторыя – культура – мастацтва : мат-лы навук. каферэнцый 1994, 1998 гг. – Варшава – Мінск, 1998. – С. 50–53.
14. Резолюция съезда белорусов-воинов 2-й армии // Белорусская Рада – 1917 – 8 декабря (№ 6) – С. 3–4.
15. Смета расходов по содержанию коменданта и стражи в замке бывшего Князя Радзивилла в Несвиже и парка при нем // НАРБ – Ф. 804 – Оп. 1 – Д. 26. – Л. 2–2об.
16. Aftanazy, R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej / R. Aftanazy – Wrocław – Warszawa – Kraków, 1992. – T. 2. Województwa brzesko-litewskie, nowogródzkie. – 476 s.
17. Albrecht Radziwiłł – rewindykcja mienia zabytkowego, 1922–1924 // Archiwum Główne Akt Dawnych (AGAD) – AR – Dz. XI. – Sg. 315. – S. 1–56.